нагрузкой на организм человека. Кроме того, удлинился период его выведения из организма, что затрудняет определение медиками момента выздоровления. Более того, он признан ВОЗ самым заразным штаммом коронавирусной инфекции.

Таким образом, всего с начала пандемии в стране на первого января 2021 года было официально зарегистрировано 194 284 человек, умерло за весь период распространения коронавирусной инфекции – 1424 пациента. Летальность в Беларуси составила 0,73 %. На лечении находились 17 713 человек. Произведено вакцинаций – 2 194 993 [3].

ЛИТЕРАТУРА

1. Республиканский союз туристических организаций. Итоги по въезду-выезду туристов в 2019 году [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www. toursoyus.by. – Дата доступа: 05.01.2022.

2. Стрим / Твой вопрос Минздраву и Минобразованию о ситуации с Covid -19 в Беларуси. ГУ Национальный пресс центр Беларуси [Электронный ресурс] – Режим доступа: https://www.belta.by/society/view/karanik-rasskazal-o-prinjatyhmerahdlja-borby-s-kjrjnjvirusom-386446-2020 – Дата доступа: 05.01.2022.

3. Коронавирус в Беларуси: статистика в реальном времени [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://www. Coronavirus-Belarus.by. – Дата доступа: 05.01.2022.

УДК 947.2

А.А. Дамарад, канд. гіст. навук (БДТУ, г. Мінск)

## КНІГАДРУКАВАННЕ НА БЕЛАРУСІ Ў XVIII СТ.

З канца XVII ст. беларускае нацыянальнае кнігадрукаванне цалкам канцэнтруецца ў сценах Супрасльскага базыльянскага манастыра, дзе было выпушчана 420 выданняў, з іх беларускіх кірылаўскага шрыфту - каля 60. Самым выдатным кірылаўскім выданнем Супрасльскай друкарні можна лічыць “Лексікон” (1722). Друкарня дзейнічала да 1795 г. Яе выданні адыгралі значную ролю ў развіцці нацыянальнай культуры XVIII ст.

Друкаваліся ў канцы XVII — сярэдзіне XVIII ст. у асноўным трактаты па схаластычнай філасофіі, жыцці святых, рэлігійна-маралізатарскія і рэлігійна-палемічныя творы, календары, панегірыкі ў гонар вяльмож і маніфесты, пастановы і іншыя дакументы варагуючых магнацка-шляхецкіх партый. Кнігі каштавалі дорага і на беларускай мове не выдаваліся. Бібліятэкі меліся толькі ў буйных манастырах і палацах магнатаў, іх зборы былі недаступны шырокаму колу чытачоў. У другой палове XVIII ст. на тэрыторыі сучаснай Беларусі існавала 12 друкарняў. Кнігі ў другой палове XVIII ст. выдавалі на

стараславянскай, польскай, лацінскай, французскай, нямецкай, яўрэйскай і ў канцы стагоддзя і на рускай.

У прадукцыі друкарняў усё большую ўдзельную вагу ў параўнанні з часам контррэфармацыі займала свецкая літаратура (у той час яна складала 50 % усіх выданняў). Лідэрам па колькасці выданняў з'яўлялася Гародзенская каралеўская друкарня, якая працавала ў 1775-1796 гг. У друкарні працавала каля 30 чалавек, мелася ўласная майстэрня для адліўкі літар, выданні вызначаліся высокай якасцю друку, паперы (яна завозілася ў асноўным з Прусіі), мастацкага афармлення. Цікавай з'явай у тагачасным культурным жыцці Беларусі былі польска-"русінскія Тродзенскія гаспадарчыя календары", якія друкарня выдавала штогод. Гэты від выданняў падрыхтаваў не толькі глебу для перыядычнага друку, але і чытачоў будучых газет. Гродзенскія календары выходзілі да канца XVIII ст. вялікім тыражом.

У маі 1776 г. пабачыла свет першае перыядычнае выданне на тэрыторыі сучаснай Беларусі – "Газета Гродзенска". На дзвюх яе старонках фарматам 20х15 см на польскай мове змяшчаліся артыкулы пра найбольш значныя падзеі ў Рэчы Паспалітай, Расіі, Заходняй Еўропе, асвятлялася мясцовае жыццё, друкаваліся аб'явы і паведамленні. Газета спраўна выконвала сваю асноўную функцыю – прадстаўленне аператыўнай інфармацыі і, галоўнае, ішла разам з часам. Упершыню на яе старонках чытач мог пазнаёміцца з крытычнымі матэрыяламі па надзённых грамадска-палітычных праблемах.

У канцы XVIII ст. у Гародні выходзілі яшчэ дзве газеты: у 1792 г. – "Ведамасці Гродзенскія" і "Кур'ер Літоўскі" (1796-1797).

У Нясвіжскай друкарні Радзівілаў у 1750 – 1791 гг. выйшлі з друку каля 64 кніг. Пераважала рэлігійпая літаратура, сярод іншых выданняў вядомы панегірычйыя вершы і прамовы, творы антычных аўтараў, падручнікі.

Універсальны характар кніжнай прадукдыі прыватных друкарняў са дзейнічаў пашырэнню сферы распаўсюджання кнігі, стымуляваў дзейнасць творчай інтэлігенцыі.

ЛІТАРАТУРА

1. Мальдзіс А.І. Кнігадрукаванне Беларусі ў XVIII ст. // Книга, библиотечное дело и библиография в Белоруссии. Мн.: "Беларуская навука", 1974. С. 82 – 86.

2. Кніга Беларусі 1517 – 1917. Зводны каталог. Мн., 1986.

3. Мальдзіс А.І. Календары, выдадзеныя ў Беларусі ў XVIII ст. // Белоруссии. Мн.: "Беларуская навука", 1977. С. 65 – 68.